Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 МАЯ 2016 г. АЎТОРАК № 91 (28201) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Які час, такая і архітэктура

СТАР. 4

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



Малочныя рэкі зменяць напрамак?



«Еўрабачанне» скончылася, пытанні засталіся

СТАР. 16

# МАЦІ, ДЗЯЎЧЫНА І АЙЧЫНА

## Спрадвеку ў кожнага мужчыны павінны быць тры любові, якія ён гатовы пранесці праз усё жыццё і, калі спатрэбіцца, абараніць



Фота Надзеі БУЖАН.

**Адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Беларусі працягнецца да канца мая. Першымі — амаль 1200 прызыўнікоў — армейскія шэрагі папоўняць прадстаўнікі сіл спецыяльных аперацый, Ваенная камендатуры Узброеных Сіл і органаў дзяржаўнай бяспекі краіны.**

— У адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі, гэтай вясной да выкліку на прызыўныя камісіі падлягае 57 тысяч маладых грамадзян нашай краіны, — адзначыў **намеснік начальніка Галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Юрый КУЗЬМІН.** — У цяперашні час у ваенных камісарыятах завяршаецца медыцынскі агляд прызыўнікоў. Прызыўнымі камісіямі раёнаў і гарадоў ужо вынесена больш як 37 тысяч рашэнняў. Улічваючы патрэбу Узброеных Сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў у камплектаванні асабовым складам, у армію планеўецца накіраваць да 10 тысяч чалавек. Акрамя таго, да тысячы чалавек у гэты перыяд будзе адпраўлена для праходжання службы ў рэзерве.

Прадастаўлена звыш 23 тысяч адтэрміновак. Асноўную частку — 70% — складаюць адтэрміноўкі для працягу адукацыі. Іншыя юнакі атрымалі адтэрміноўку па стане здароўя, сямейных абставінах, для набыцця ваенна-тэхнічных спецыяльнасцяў.

З тымі, хто крыху раней апране ваенную форму і, як кажуць, папоўніць шэрагі армейскай эліты, карэспандэнты «Звязды» сустрэліся ў Мінскім гарадскім ваенным камісарыяце.

Міхаіл Ваўчок будзе служыць у Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл. Якія абавязкі лягуць на яго плечы ў бліжэйшы год, юнак пакуль не ведае. Але спадзяецца, што свой воінскі доўг будзе выконваць у складзе роты ганаровай варты. А яшчэ і спецыяліст харошы: з гаспадаркі, дзе Міхаіл працуе ветурачом, хлопца адпускаць не хацелі. Сказалі, будуць чакаць.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар НАЗАРАНКА, старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*«Якасць прадукцыі — гэта найважнейшы складнік канкурэнтаздольнасці. Перад рэальным сектарам эканомікі стаіць задача не толькі не страціць дасягнуты ўзровень канкурэнтаздольнасці, але і аператыўна, у вельмі кароткія тэрміны максімальна выкарыстоўваць усе існуючыя рэзервы і інструменты, у тым ліку прапанаваныя сусветнай практыкай, для яе павышэння. Але трэнд сёння — кіраўнічы рэсурс, які павінен вызначыць стратэгію развіцця прадпрыемства ў доўгатэрміновай перспектыве, абраць тактыку паводзін і самае галоўнае — павесці за сабой калектыў да дасягнення пастаўленых мэтаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19261,00 | ▼ |
| Еўра | 21803,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 296,83 | ▲ |
| Укр. грыўня | 758,31 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Надвор'е

# ДОЖДЖ І ДРЫЖЫКІ

## Цяплець ізноў пачне толькі ў чацвер

**Сапраўды майскае надвор'е вернецца ў Беларусь толькі ў другой палове тыдня, paведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

А пакуль першую палову тыдня надвор'е будуць фарміраваць халодныя і вільготныя паветраныя масы з паўночнага захаду Еўропы. Таму сярэдняя тэмпература паветра прагназуецца на 1—3 градусы ніжэй за норму. У аўторак на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымы навальніцы. Тэмпература паветра складзе плюс 11—17 градусаў.

Кароткачасовыя дажджы прагназуюцца паўсюдна і ў сераду. Удзень у асобных раёнах магчымы навальніцы, уначы і раніцай — месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 цяпла, удзень — ад плюс 11 да 17 градусаў.

СТАР. 3

